# НББ запрашае наведаць выстаўку «І кнігі святкуюць юбілеі»

16.07.2023 10:20 | **Культура, Літаратура**

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі запрашае наведаць выстаўку «І кнігі святкуюць юбілеі». Да 31 снежня ў кальцавой галерэі 3-га паверха можна пазнаёміцца з выданнямі-юбілярамі 2023 года. Часовымі экспазіцыямі такога кшталту бібліятэка дэманструе багацце фонду, у які ўваходзяць і выяўленчыя дакументы да выданняў, што таксама складаюць важную частку выстаўкі. Праект адрасуецца шырокаму колу чытачоў.**




«Новая Зямля» Якуба Коласа (выданне 1927 года).

Сустракаюцца кніжныя выстаўкі настолькі змястоўныя і багатыя на цікавыя звесткі, што самі выданні адыходзяць на другі план. Частымі з'яўляюцца і тыя, мэта якіх — паказаць найлепшыя ўзоры мастацкага афармлення. І першыя, і другія прыцягваюць увагу не толькі аматараў чытання, але і даследчыкаў літаратуры і гісторыі, мастацтвазнаўцаў, для якіх пытанне афармлення выдання — а ў шырокім сэнсе развіцця кніжнай графікі — сёння стаіць надзвычай востра.

Выстаўка «І кнігі святкуюць юбілеі» не з такіх. Яна болей прыземленая, фармальная. Натуральна, кніга ёсць кніга, і кожная яе дэталь, любая драбніца афармлення здольна выклікаць шчырае захапленне. Ды і арганізатары не пазбавілі гледача невялічкіх каментарыяў і дадатковай інфармацыі. І ўсё ж гэтага замала для грунтоўнай экспазіцыі. Выстаўка, прысвечаная юбілеям кніг беларускай і замежнай літаратуры, — усяго толькі зварот у мінулае (экзэмпляры прадстаўлены ў храналагічнай паслядоўнасці: ад 500-гадовых юбіляраў да 50-гадовых). Хоць нагода ёсць — чытачу прапаноўваюць адзначаць юбілеі. А хто адмовіцца ад свята?




Фрагмент экспазіцыі. Фота аўтара.

Найлепшы спосаб павіншаваць так званых юбіляраў — чытаць і перачытваць. Якраз тут прыйшоў час паразважаць аб тым, якія менавіта кнігі выбралі стваральнікі тэматычнай выстаўкі. Двума словамі — бессмяротная класіка, тая самая, пра якую шмат чулі, але недапушчальна мала ведаем. Ці шмат беларусаў чыталі паэму Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра», якой сёлета споўнілася ажно 500 гадоў? Ці знаёмы з беларускамоўным перакладам казкі «Брыдкае качанё» (1843) Ханса Крысціяна Андэрсена? Ці ёсць у сучасніка жаданне асэнсаваць, напрыклад, раман Міхася Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі» (1927), прысвечаны тэме рэвалюцыі? Пытанне зацікаўленасці і імкнення вывучаць літаратуру заўсёды будзе паўставаць, а выстаўкі такога кшталту бачацца чаканым штуршком, звычайнай спробай заахвоціць да чытання. Іншая справа, як сёння ўспрымаюцца тыя ж «Пярэстыя казкі» Уладзіміра Адоеўскага, выдадзеныя ў 1833 годзе, наколькі актуальнымі могуць быць «Страчаныя ілюзіі» (1837) Анарэ дэ Бальзака і ці па-ранейшаму зачароўвае «Востраў скарбаў» Роберта Льюіса Стывенсана — знакаміты твор, які пабачыў свет у 1883 годзе і стаў любімым прыгодніцкім раманам некалькіх пакаленняў чытачоў па ўсім свеце.




«Яўгенія Грандэ» Анарэ дэ Бальзака (выданне 1827 года). Фота аўтара.

Між тым менавіта на гэтыя і іншыя выданні імкнуцца звярнуць увагу наведвальніка ў Нацыянальнай бібліятэцы. Мабыць, гэта не самыя выпадковыя варыянты — юбілееў кніг можна «адкапаць» колькі заўгодна, але не кожную з іх бібліятэкары гатовы прапанаваць. Сярод твораў, з якімі яны раяць пазнаёміцца, — сентыментальны раман «Белыя ночы» Фёдара Дастаеўскага (1848) у выглядзе мініяцюрнага выдання (1973) і факсіміле (1923) з ілюстрацыямі Мсціслава Дабужынскага (апошняе — працяг выпуску факсімільных выданняў кніг найлепшых мастакоў пачатку XX стагоддзя). У ліку ўнікальных экзэмпляраў таксама часопіс «Репертуар и пантеон» (1844), на старонках якога быў надрукаваны першы рускамоўны пераклад «Яўгеніі Грандэ» Анарэ дэ Бальзака. Перастварыў твор Фёдар Дастаеўскі — вядома, што пераклад стаў першай публікацыяй пісьменніка- пачаткоўца.




«Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча з дарчым надпісам аўтара (выданне 1968 года). Фота з сайта nlb.by

Гонар бібліятэкі — раман «Кірмаш пыхлівасці» Уільяма Тэкерэя — прадстаўлены першымі выданнямі 1848 года. Адно з іх — з суперэкслібрысам і экслібрысам на авантытуле, другое — з прозвішчам *LWańkowicz* на тытуле, нумарам і ўладальніцкай пазнакай на авантытуле, якая адсылае да бібліятэкі смілавіцкай лініі роду Ваньковічаў у Шыпянах. Варта ўбачыць і першыя выданні твораў Янкі Купалы (трэці зборнік вершаў «Шляхам жыцця», 1913; п'есы «Паўлінка», 1913; «Раскіданае гняздо», 1919), а таксама адзіны прыжыццёвы зборнік Максіма Багдановіча «Вянок» (1913).

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

Навіны | Папулярнае

09:55 Карлас Алькарас упершыню стаў пераможцам Уімблдонскага турніру
09:36 Рух чыгуначнага транспарту праз Крымскі мост пасля надзвычайнага здарэння адноўлены
09:14 Ратавальнікі прадухілілі падзенне жанчыны з 24-га паверха дома ў Мінску
08:50 Рух транспарту па Крымскім мосце спынілі з-за надзвычайнага здарэння
08:29 Гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў на «Славянскім базары ў Віцебску» заваявала армянка Маша Мнджаян
08:05 Лукашэнка павіншаваў каманду «МАЗ-СПОРТаўта» з перамогай на ралі-

УСЕ НАВІНЫ